

Фота Тані Капітонавай

# Максім Осіпаў

мастак, суарганізатар фестываляў SPRAVA (2018–2020) і «Вялікі гасцінны двор» (2018). Асноўная сфера інтарэсаў – вывучэнне, асэнсаванне і сучасная інтэрпрэтацыя культурнай спадчыны Беларусі і ўключэнне грамадства да дыскусіі.

# «Я магу ўсё патлумачыць»

Максім Осіпаў

# «I Can Explain Everything»

This graphic cycle by the Belarusian artist Maxim Osipau includes several works written in the style of naive Belarusian folk art – the art of painted wall carpets, with a special reference to a folk painter Alena Kish. The typical images and characteristic rules of this folk genre allowed Maxim Osipau to create a great visual narrative devoted to the problems of the very existence of Belarusian culture, as well as our relationship with the past, history, memory, national symbols and cultural heritage. Maxim deliberately sharpens examined issues in order to provoke society into a discussion.

Дзеячы нацыянальнага Адраджэння 90-х культывавалі легенду, згодна якой пасля вяртання крыжа Еўфрасінні Полацкай на Беларусь адразу абрынецца манна нябесная. Я ж лічу, што прыняцце нашым грамадствам сябе адбудзецца ў момант, калі маляваныя дываны Алены Кіш апынуцца ў экспазіцыі мастацтва XX стагодзя Нацыянальнага мастацкага музея. Так, менавіта там, а не ў зале наіў-арту альбо дэкаратыўнай творчасці. Свінец беларускага архаічнага мастацтва калісьці быў ператвораны ў золата пранырлівым Маркам Шагалам, аднак паклады таго золата так і ляжаць, чакаючы свайго часу.

Некалькі гадоў таму я зацікавіўся тэмай маляванак і захацеў зрабіць сабе копію дывана Алены Кіш, але ўрэшце адмовіўся ад першапачатковай задумы, у выніку змяніўшы першапачатковы сюжэт, каб «выгнаць» Адама і Еву Мазачча з Раю слуцкай мастачкі-самавукі. Атрымалася перадаць уласную эмоцыю ад змены прафесіі і ладу жыцця навогул.

Так сталася, што вузкіх абмежаванняў жанра, які шмат хто лічыць прымітыўным і другасным, інакш кажучы – кічам, аказалася дастаткова, каб ператварыць маляваны дыван у візуальнае апавяданне, зрабіць яго інструментам для разважанняў на складаныя, а часам жорсткія тэмы. Па трапнаму выразу аднаго з маіх хэйтэраў, я пачаў нахабна маляваць па свядомасці, трымаючыся асноўных законаў жанру, якія вельмі проста знаходзіць гледача.

Мае дываны таксама не надта добра прамаляваныя. Халсціна – не прафесійная, фарбы – з будаўнічай крамы, далібог хаця б пэндзлі сам не раблю. Але гэтыя працы могуць ажыццяўляць экспансію ў прасторы куды больш агрэсіўна, чым будзь-якая карціна. Простай мовай маляванага дывана я спрабую пранікнуць у сваю беларускую свядомасць. Я пішу асабістую найноўшую гісторыю, свой дзённік, старонкі якога той-сёй зможа прычапіць сабе на сцяну.

Шмат гадоў таму я трапіў на спектакль Цыліндр па творы Эдуарда Дэ Філіпа ў Віцебскім тэатры імя Якуба Коласа. Сярод актораў была Зінаіда Канапелька – найстарэйшая акторка тэатру, якая працавала там аж з 1934 года. Хутка апасля яна памерла. А тады грала ў першай сцэне бабульку ў інвалідным вазку на ўмоўнай італьянскай вуліцы, дзе было яшчэ шмат іншых людзей. У пэўны момант яна ўзнялася з «трона» і голасна прамовіла сваю адзіную фразу:

## ТУРЫСТЫ ПРЫЕХАЛІ

Вуліца імгненна ажыла, людзі пачалі нешта рабіць і кудысьці бегчы. Не вельмі ўжо памятаю, пра што быў той спектакль, але дыван я назваў менавіта ў гонар гэтай фразы.

Ад пачатку 1990-х гадоў памятаю, як мы знаходіліся ў чаканні ўяўных замежных турыстаў. Чакалі іх «як жыды месію». Яны мусілі адпачыць на нашай зямлі пад ценню белых крылаў, падзівіцца нашым аўтэнтычным вышыванкам, пашпацыраваць шырокімі праспектамі, зазірнуць у вочы блакітных азёраў, за валюту купіць нашыя шкляныя каралі, пакінуўшы кучу манетак ў буйным фантане нашае гасціннасці і добразычлівасці, каб потым вяртацца да нас ізноў.

Мы глядзелі на сябе вачыма турыстаў, якіх самі стварылі ў мроях. Уяўныя турысты нават трапілі ў перадпраектную дакументацыю замкаў ды палацаў. Рэальныя турысты і іх допісы пра Беларусь нязменна прыцягваюць нашу ўвагу: мы пільнуем, каб іх меркаванні не надта разыходзіліся з меркаваннямі нашых уяўных сяброў.

Беларусь намалявана тут у вобразе спрута, што цягне турыстаў у абліччы Калумба ў свае вільготныя абдымкі. Беларусь не мае формы, не ведае, хто яна і што хоча сказаць міру. Яна проста чакае, што яе палюбяць іншыя перад тым, як яна пагодзіцца зразумець і палюбіць саму сябе. Беларусь патрабуе гэтай любві. Інакш яна сябе палюбіць не можа. Проста палюбіць, неўзіраючы на чужыя меркаванні ды патрэбы.

Вясна 2020, беспрацоўе з-за COVID, валанцёрства для медыкаў.



Гэта праца знаходзіцца ў Маладзечна ў выглядзе мурала на адным з рынкаў. Скончыўшы мурал, стомлены, бліжэй да ночы я вяртаўся электычкай у Мінск ды посціў здымкі і тэкст пра мурал ў Instagram. Раніцай прачнуўся знакамітым. «Гадзіла ў вышыванцы» стала тэмай дня, а можа і тыдня. Пачаліся спрэчкі, сталі выходзіць артыкулы ў духу «Што насамрэч хацеў сказаць аўтар?», быў нават верш пра Гадзілу, а таксама пагрозы гвалта. Але адначасова ўзнялася цікавая і важная дыскусія, мне ўсё гэта спадабалася і захацелася рабіць так увесь час.

## ПОКЛІЧ ДА ВЫТОКАЎ

У Маладзечна шмат дзесяцігодзяў ладзілі фестываль. Там была песня-гімн са словамі, якія для гэтага дывана сталі назвай. Калі вам больш за 30, вы дакладна яе памятаеце: «Да вытокаў будзе вечна / Клікаць блізка і здалля / Маладзечна, Маладзечна / Беларуская зямля».

Так, гэта – пра нашы традыцыі і пра тое, як мы іх разумеем.

Дыван быў натхнёны тымі, хто бясконца заклікае адраджаць і шанаваць разнастайныя традыцыі, не вельмі ўдаючыся, навошта нам яны патрэбныя сёння і зараз. Часам мы хапаемся за знешнія прыкметы традыцыі, не кранаючы сэнсаў, якія яны мелі тады і якія павінны мець зараз.

Мне цяжка пагадзіцца, што мы прэзентуем сябе формай, а не зместам. Напрыклад, вышываначная эпідэмія, узніклая ў Беларусі ў 2014 годзе пасля пачатку вайны ва Украіне. Вышыванкі паўсюль – на цішотках, на кубках, на пакунках зефіра. А сэнсы? Не, пра іх мы казаць не хочам. Вось шпаргалка: гэты ромбік сімвалізуе сонца, гэты – нясе вечную маладосць, а гэты – дорыць здароўе. Нагадвае «Бітву экстрасэнсаў». Такая сабе ВышыВанга.

Калі традыцыі ствараліся, яны неслі ўтылітарныя функцыі. Мець адзенне з арнаментамі – ад сурокаў; майстраваць агароджы на могілках – каб каровы не елі кветкі з магіл; будаваць замкі – ад нападу ворагаў; біць дзяцей і жонак – каб ведалі месца на сацыяльнай лесвіцы. Мы ж успрымаем традыцыі як нейкія талісманы, якія маюць адрадзіць і захаваць нашу свядомасць… замест нас.

Намаляваная Гадзіла ў традыцыйным жаночым строі заклікае неадкладна шанаваць традыцыі натоўп, складзены з выпадковых персанажаў хрэстаматыйных карцін са школьнай праграмы. Думкі персанажаў падзяліліся: сустракаць Гадзілу з помпай ці бегчы хто куды. Бо традыцыі без разумення іх каштоўнасці могуць зусім не адпавядаць сучасным чаканням.

Вясна 2019 – пачатак 2020, подых навальніцы.



Гэта гісторыя – пра падарожжы думак і перакананняў. І першыя, і другія ў нас аніразу не фундаментальныя, не статычныя і залежаць ад асяроддзя, у якім мы зараз знаходзімся.

## СВАБОДА ГАЛАСУЕ НА РОСТАНЯХ

Тут – пра кароткі момант абсалютнай валацужнай адзіноты ў час, калі аўтаспын не спрацаваў, і машына, якая амаль ужо спынілася, усё ж рушыла наперад, пакідаючы за сабой пякучы след з сумневаў у людской чалавечнасці.

Свабоду, што кліча народ Дэлакруа лёгка апазнаць. Але тут Свабодзе няма каго клікаць. Ані да рэвалюцыі, ані да вытокаў. Вобраз Свабоды без атачэння буржуа і гаўрошаў на барыкадах робіцца бездапаможным. Вобразы гандлярак – гэта пра тых беларусаў, што ганлявалі кветкамі падчас разгонаў мітынгаў і пра тых, кто вудзіў рыбу пасярод палаючага леса ў час вясновых падпалаў мінулагодняй травы.

С левага боку – рэмейк іконы Узнясенне святога Іллі невядомага майстра з царквы с. Латыгава ля Віцебска. Гэты аўтар XVIII стагоддзя шчэ атрымае народную славу. Яго абразы выглядаюць абсалютна чалавечымі гісторыямі пад тоўстай скурай сакральных біблейскіх сюжэтаў. Таму святы Ілля тут нясецца сабе жывым на неба на вогненным UBERы з кіроўцам-анёлам, прыхапіўшы вядро зямных дароў. «Бог дапаможа», – адказвае ён Свабодзе.

Праз імгненне роспачы Свабода мусіць прыняць рашэнне: ізноў галасаваць ці вучыцца заставацца Свабодай у тым асяроддзі, якое пакуль не выглядае краінай для жыцця, хаця і балотам яго таксама ўжо не назавеш.

Вясна 2021, гісторыя з Ryanair і шмат чаго іншага адбываецца.



Гэты дыван з'яўляецца Double Feature – напрыканцы я змяніў першапачатковы эскіз і падзяліў сюжэт на два.

## АД ПРАДЗЕДАЎ СПАКОН ВЯКОЎ МНЕ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

20 гадоў таму ва ўніверы мы малявалі чэрап невядомага мужчыны з амаль цэлымі зубамі, які наш выкладчык знайшоў недзе на балоце. Мая аднагрупніца ў руцэ з ім у паставе Прынца Дацкага дэкламавала: «Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына». Гэты жарт зачапіўся з-за сваёй шматслойнасці.

У дзяцінстве я меў чыста паганскае ўспрыняцце могілак. Шчыра верыў, што на Радуніцу і Дзяды мёртвыя вылазяць з магіл, каб з'есці ўсе булкі і цукеркі ды выпіць усю гарэлку, што мы ім пакінулі. Падабалася хадзіць па могілках, гледзячы на прыгожых, прадстаўнічых, практычна ідэальных людзей, уяўляючы, як яны ўначы будуць граць у біткі яйкамі, есці нашыя пасхі ды запіваць гэта абавязковымі стопкамі гарэлкі.

Калі на могілках з'явіліся магілы людей, якіх я ведаў асабіста, узнік дысананс. Непрыемныя і сварлівыя бабы на помніках выглядалі добрымі феямі, жартаўнікі – сур'ёзнымі, нярахі – акуратнымі, гопнікі – інтэлігентнымі. Чаму гэта завецца «помнік»? Гэта ж не пра памяць, а пра пачуццё уласнасці «дзяцей і ўнукаў» у адносінах да родных костак і зямлі, дзе яны ляжаць.

Адтуль і штучныя кветкі атрутных колераў. Гэта не дзеля прыгажосці, а каб кожны ведаў: гэты простакутны прышчык на целе Радзімы належыць дбайнаму гаспадару. Нават багатаму гаспадару, калі помнік нятанны. І вельмі заможнаму гаспадару, калі ён штогод замест карамелькі кладзе ля кілішка «Грыльяж у шакаладзе».

У малых гарадах і вёсках Беларусі шмат гаспадарак стаіць раскіданым гняздом, але сямейныя аградкі на могілках – у ідэальным стане. Такая наша спадчына, такая ласка матчына. Агледзіны робім двойчы на год: на Радуніцу і на Дзяды.

## НАШТО ТЫ МЯНЕ ПАКІНУЎ, ОЙЧА

Другая частка дывана – ілюстрацыя Хаджэння па вадзе Ісуса Хрыста, дзе выкрадаецца найважнейшая частка – Ісус, а святы Пётр амаль патануў.

Верш Купалы Спадчына яшчэ ёсць у школьнай праграме. Пэўна да гэтага часу настаўніцы вяшчаюць, што ён – пра любоў да роднай прыроды. Быццам у 1918 – годзе акупацыі і кароткага існавання БНР – нармальны аўтар мог проста баіць пра прыгажосць узгоркаў роднага поля. Верш Купалы – пра пачуццё ўласнасці ў адносінах да краіны, а не да сваіх шасці сотак ці сямейнай аградкі на пагосце. Змест, які мы згубілі...

Так дзіўна, што толькі смерць падзяляе нас на папярэднікаў і спадкаемцаў. Але хіба можна пакінуць камусьці ў спадчыну тое, што сам не атаясамляеш уласным? Апроч касцей. Законныя спадкаемцы будуць адчуваць сябе акупантамі паўсюль. Апроч могілак.

Травень 2021, зварот да нацыянальнай літаратурнай класікі ў пошуках адказаў.



Гэты дыван – нешта накшталт раскадроўкі для нацыянальнага зомбі-хорара. Асаблівасць нашых зомбі – паўстаюць не самі мерцвякі, а іх помнікі.

У апошні год дзяржава стамілася шукаць прыхільнікаў сярод жывых і натуральным чынам звярнулася да маўклівых мёртвых герояў, сярод бронзавых і гранітных вобразаў якіх мы жывем. Вобразы – далёкія ад людзей, косткі якіх пакрываюць. Кожны герой, далучыўшыся да мёртвых, ператвараецца ў такі вобраз на пастаменце, які з дапамогай правільнай інтэрпрэтацыі можна ператварыць у свайго ідэалагічнага сябра.

## ПАМЯЦЬ УЖО НЕ ТАЯ

На гэты дыван мяне натхніў расійскі карыстальнік Facebook з Рыгі. Ён казаў, што мы абавязаныя жыць у савецкай парадыгме, бо за яе памерла шмат герояў. Што праз гэта я не маю аніякага маральнага права шукаць свае інтарэсы. Я наўпрост візуалізаваў свет ягоных думак. Жывыя людзі змагаюцца з помнікамі за права на існаванне.

Праз пару месяцаў пасля стварэння гэты дыван «накаркаў» з'яўленне на Гомельскім гарадскім свяце партатыўнай «братэрскай магілы» і «Хатыні на калёсіках». Так, у маёй краіне ўжо ставяць макеты магіл на гарадскіх святах. Бо сапраўдных магіл дзяржаве ўжо не хапае. Кожны чацвёрты быў мёртвы, а пакрыццё слабое. З'явілася нават мода запускаць «жывыя статуі», падобныя да шмат разоў перафарбаваных срэбнай фарбай бетонных салдат і партызанаў на брацкіх магілах. Такі сабе *бессмертный полк*.

Я любіў наведваць могілкі і часам думаў, чаму помнік завецца помнікам? Гэта ж нейкі бяспомнік – пануры, урачысты і зусім не інфарматыўны. Галоўнае дасягненне жыцця – колькасць гадоў і фота. І подпіс «ад каго». Дадай «каму», і ўжо нібыта ляжыш у непразрыстай капэрце лістом, адасланым ў вечнасць. Сам ліст ніхто не прачытае. Калі ёсць «ад дзяцей і ўнукаў» – можна лічыць, што жыццё ў нябожчыка было нішто сабе: пакінуў жа на зямлі ДНК.

Пра асобу памерлага ўвогуле вельмі складана нешта даведацца нават у сваякоў. У нас пра памерлых – добра або нічога. Памёр – вось і нічога, вось і добра.

Малым у бабулі я запытываў, чаму ў габрэйскіх могілак такія высокія агароджы. «Каб жыды не павыскоквалі», – змрочна адказала яна. Зараз у гэтага жарта маецца яшчэ адзін сэнс.

Устаноўка помніка ў нас – нешта накшталт апламбіравання жывой памяці. Але не пра ейнае захаванне, хутчэй пра поўнае забыццё, пра нябыт. А апламбаваная памяць – штука небяспечная, як тая бомба, што яшчэ чакае свайго часу ў Знаку бяды Быкава.

Чэрвень, 2021. Шмат меланхоліі, аніякай сентыментальнасці.


ГДЗЕТВАЯ
БАБУШКА
????!????

Дыван быў распачаты напярэдадні 24 лютага, пасля на паўтара месяца быў закінуты, як урэшце і ўсё. Потым я вырашыў яго скончыць. На той час у майстэрні быў сабачы холад, таму малявацьзіму было даволі натуральна.

Гэта – рэмейк карціны Казакова Снежань са знаёмым з маленства сюжэтам драматычнага забойства і смалення вепрука на Каляды. Адметнасцю той працы з'яўляецца дакладнае адлюстраванне паху паленай свіной поўсці. Далей ідуць іншыя пахі. Кроў, смаленая кіўбаса, смажаны часнык. Шмат, вельмі шмат ежы.

Праца мае назву, якую я гатовы прапанаваць у якасці нацыянальнай ідэі.

## МЫ З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ З'ЯМО ЎСЁ, ШТО СПРАБУЕ НАС ПАДПАРАДКАВАЦЬ

Эпіграф ад Хасэ Артэгі-і-Гасета (у маім адвольным перакладзе з гішпанскай): «Той, хто насамрэч імкнецца стварыць новую сацыяльную і палітычную рэчаіснасць, найперш павінен турбавацца аб знішчэнні самых трывалых гістарычных штампаў у выніку сітуацыі, якую ён стварае. Я назваў бы геніяльным палітыка, ад першых рэформаў якога з'ехалі б з глузду ўсе настаўнікі гісторыі, якія пабачылі б, як усе ‹законы› іх навукі губляюць сілу, руйнуюцца ўшчэнт і ператвараюцца ў труху. З мінулым нельга змагацца ўручную. Будучыня перамагае мінулае, толькі калі паглынае яго цалкам».

Паспрабуйце ўявіць:

- Праклятую беларускі фаталізм;
- Абыякавасць, памяркоўнасць і хатаскрайнасць;
- Болькі, шнары і траўмы, якія мы так любім расчэсваць да крыві;
- Цяжкі досвед, які мы з гонарам носім на сабе, як тое непрыгожае дзіцё катлету на шыі, каб з ім сябравалі хаця б сабакі;
- Упартае пачуванне сябе аб'ектам, а не суб'ектам;
- Засяроджаннасць на захаванні культуры, а не на яе развіцці насуперак усяму;
- І нават *русский мир*, якім мы ўжо надыхаліся.

Усё гэта – ежа. Сытная, карысная, каларыйная, але ежа. Усё гэта – туша ўзгадаванага намі монстра, які рохкае ў пуні, патрабуючы пільнай ўвагі, корма і іншага клопату. З ім немагчыма змагацца – ён больш важкі. Ад яго немагчыма збегчы – ён будзе побач, бо вы – яго гаспадар. Пра яго немагчыма забыцца – ён заўсёды нагадае. Яго можна толькі з'есці.

Таму самы час падзяліць монстра на шынку і карэйку, грудзінку і кумпячок, галяшку і рульку. І паглынуць, ператварыўшы яго бялкі, тлушчы і вугляроды ў чыстую карысную энергію. Прынамсі, пакуль ён сам канчаткова не паглынуў нас.

Зіма – вясна 2022.

